# СВАБОДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

№ 6 (55), 8 –14.02.2007 г.

# ГЭТА САЛОДКАЕ СЛОВА – СВАБОДА

## ЯШЧЭ НЕ ЎСЕ Ў БЕЛАРУСІ ЗМІРЫЛІСЯ З ПАРАДКАМ РЭЧАЎ

У нядзелю на кватэры ў Мінску, каля Камароўскага рынку, сабраліся на сход юнакі і дзяўчаты – больш за дваццаць чалавек, якіх называюць маладафронтаўцамі. Прыехалі хлопцы з розных рэгіёнаў Беларусі, прыехалі некалькі чалавек з Польшчы, якія вучацца там па праграме Каліноўскага.

Як толькі сцямнела, у кватэру ўварваліся байцы спецназу, супрацоўнікі МУС і КГБ. Паводле сведкаў, усіх прысутных прымусілі пры панятых назваць пад відэазапіс свае імёны і прозвішчы. Забралі мабільныя тэлефоны. (Як піша газета "Наша Ніва", адзін з хлопцаў паспеў схаваць тэлефон і адправіць СМС-паведамленне, дзякуючы якому пра падзеі адразу стала вядома журналістам і яны змаглі зрабіць фатаздымкі).

Пасля таго, як усіх затрыманых вывелі, у кватэры пачаўся ператрус. Як потым стала вядома, адначасова ператрус адбыўся яшчэ на некалькіх кватэрах. Затрыманых на аўтазаку адвозілі ў бліжэйшы апорны пункт МУС. Аднаму з іх – імаверна, гэта быў Зміцер Хведарук, абматалі галаву курткай і запіхнулі ў аўтамабіль ГАЗель.

Усяго ў той вечар былі затрыманыя 27 чалавек, у тым ліку, непаўнагадовыя. Праз некалькі гадзін усіх выпусцілі, акрамя двух – Змітра Хведарука і Алега Корбана. Корбана выцягнулі з дому, дзе ён адзначаў свой дзень нараджэння. Абодвух пасля шматгадзіннага допыту даставілі ў "амерыканку", турму КГБ. Супраць іх узбуджаная крымінальная справа з абвінавачаннем у прыналежнасці да незарэгістраванай арганізацыі. Як вядома, лідэр Маладога фронту Зміцер Дашкевіч раней быў асуджаны на гэтай жа падставе на два гады зняволення, і зараз адбывае пакаранне ў калоніі.

Насце Палажанцы, затрыманай сярод іншых у той вечар, пагражае выключэнне са школы.

Чаму я так падрабязна пераказваю дэталі затрыманняў? Таму што яны нагадалі мне тое-сёе з прачытанага і бачанага раней. І, думаю, не толькі мне. Але зараз размова не пра Плошчу і разгон намётавага лагера. (Дарэчы, у сакавіцкія дні мінулага году тая плошча, мабыць, і мела права называцца імем Каліноўскага. А зараз яна, як і раней – Кастрычніцкая, і не трэба падманваць самія сябе.)



**«МАЗ-аўтазак»**, *у які заводзілі затрыманых на прыватнай кватэры маладых актывістаў. Двух з іх – Алега Корбана і Змітра Хведарука – КГБ абвінавачвае ў прыналежнасці да незарэгістраванай арганізацыі "Малады фронт". Мінск, 4 лютага 2007 году. Фота "Нашай Нівы".*

У 1950-м годзе былі расстраляныя ўдзельнікі так званай "Ленінградскай справы", па якой у зачыненых судах былі асуджаныя некалькі тысяч партыйцаў сталінскай школы. Дык вось, паводле ўспамінаў відавочцаў, найбольш высокапастаўленых арыштантаў прывозілі ў суд з мяхамі на галаве – як было прынята ў сярэднявечнай інквізіцыі. Кажуць, гэта прыдумаў асабіста Віктар Абакумаў, якога Сталін прызначыў пасля вайны Міністрам дзяржбяспекі. Гэта той самы Абакумаў, які кіраваў прыканцы вайны гвалтоўным высяленнем беларусаў з Беласточчыны ў СССР. У 1952-м годзе яго расстралялі па абвінавачанні ў фальшаванні..."Ленінградскай справы". Гэта інфармацыя для развагаў тым, хто сёння спрабуе адраджаць змрочныя сярэднявечныя традыцыі ЧК-НКВД-МГБ .

А яшчэ пры поглядзе на сённяшнія фотаздымкі ўспамінаецца савецкі фільм "Гэта салодкае слова свабода". Яго паставіў рэжысёр Вітаўтас Жалакявічус – аўтар славутага фільма "Ніхто не хацеў паміраць", у якім упершыню ўдалося праўдзіва паказаць змаганне літоўскіх партызанаў з савецкай акупацыяй за незалежнасць.

Пазней, у 1972-м годзе, рэжысёр зняў "Гэта салодкае слова – свабода". Фільм быў значна слабейшы. У ім распавядалася пра нейкую выдуманую краіну ў Лацінскай Амерыцы, і дзеянне карціны нагадвала нейкую рамантыч-

Працяг на стар. 3

## ЧАС ДРАЖНІЦЬ КРАМЛЁЎСКІХ ГУСЕЙ?

### АРТЫКУЛ ВАЛЕРА ФІЛІНА

► СТАР. 5

## ЯК ЖУРНАЛІСТЫ РОДНУЮ МОВУ ЎСПОМНІЛІ

### АГЛЯД ДРУКУ

► СТАР. 6

# КАЛІ І НАВОШТА ЛЮДЗІ МОГУЦЬ ЗНОЎ ВЫЙСЦІ НА ПЛОШЧУ?

**ВІНЦУК ВЯЧОРКА, СТАРШЫНЯ ПАРТЫІ БНФ:**

## “КАЛІ ЎЗНІКНЕ ПАГРОЗА НЕЗАЛЕЖНАСЦІ”

Ёсць рацыянальныя і ірацыянальныя матывы. Ірацыянальныя апяяў Якуб Колас у вядомым сваім пасажы: “Я маўчу, маўчу, трываю”. Што да рацыянальнага, то гісторыя паказвае – бывае матэрыяльная матывацыя. Калі мноства людзей, дагэтуль не палітызаваных, выходзіць на пляцы. Адбываецца гэта тады, калі знянацку пагаршаецца жыццёвы ўзровень, нават не нашмат. Калі знянацку знікаюць пэўныя жыццёвыя гарантыі. А для людзей, якія ў прынцыпе ёсць істотамі палітычнымі, матывам можа быць рэальная пагроза страты незалежнасці нашай краіны. Так, як гэта было ў 1996-м годзе.

**ВАСІЛЬ, ПРАДПРЫМАЛЬНІК:**

## “ТРЭБА, КАБ БЕЛАРУСЫ РАЗЗЛАВАЛІСЯ”

Трэба, каб беларусы ўсур’ёз раззлаваліся. А для гэтага павінна нешта жудаснае адбыцца. Каб заробак скараціўся разы ў два. І каб яго выплату затрымалі месяцы на тры. Ды ў дадатак пачаліся збоі з электрычнасцю. Ды яшчэ, каб цэны на бензін узняліся да еўрапейскага ўзроўню. (*Гэта ўжо адбылося – заўвага рэд.*) А яшчэ тэмпература ў кватэрах каб панізілася. І каб усё гэта адбылося адначасова. Вось тады яны выйдуць. І тады амону лепш хавацца ў бульбу. Бо не студэнты выйдуць, а слесары з манціроўкамі.

**УЛАДЗІМІР БЯРБЕРАЎ, КІРАЎНІК ГУРТА “ЛІЦВІНЫ”:**

## “МАСЫ ЛЮДЗЕЙ МОЖА ВЕСЦІ ТОЛЬКІ ПРАВАДЫР”

Прымусіць беларусаў масава выйсці на плошчу можа толькі правадыр. Людзі лёгка ідуць толькі за правадырамі, тады яны нічога не баяцца. Бо правадыр асляпляе. А сёння правадыроў у нас штосьці не бачна. І наўрад ці ў нас сёння можна разлічваць на пабудову дэмакратыі. А гэта спараджае апатыю. Мы ў плане грамадскай актыўнасці адкінутыя далёка назад. Да дэмакратыі ізноў стала – як да Марса.

**ЗМІЦЕР БАНДАРЭНКА, КААРДЫНАТАР “ХАРТЫІ’97”:**

## “КАЛІ АДЧУЮЦЬ СЯБЕ ПАДМАНУТЫМІ”

Беларусы, на маю думку, выйдуць на вуліцу тады, калі востра адчуюць сябе падманутымі. А якая гэта будзе прычына – пагаршэнне якасці жыцця ці падман у абяцаннях з боку ўлады, расчараванне ў выбары шляху развіцця краіны – гэта не важна. Калі яны адчуюць сябе падманутымі, большая частка беларусаў выйдзе на плошчу.

**КАНСТАНЦІН, МЕНЕДЖЭР:**

## “ПРАЦЭС РАСЦЯГНЕЦЦА НА ГАДЫ”

Тая колькасць актыўных людзей, якую мела Беларусь на пачатку і ў сярэдзіне 90-х гадоў, незваротна страчаная. І не дзякуючы Лукашэнку, які са свайго боку, наадварот, быў раздражняльнікам і правакатарам масавага абурэння. У летаргію грамадства ўпала, дзякуючы лідэрам апазіцыі. Беларусы жывуць нармальнымі людскімі інтарэсамі. Праца, дзеці, адпачынак, новая машына. Яны не прыхільнікі Лукашэнкі. Яны ўвогуле не прыхільнікі нічога. Грамадзянскіх інтарэсаў у іх няма. Іх грамадзянская тэмпература – нуль. Збіць гэты “нуль” можа толькі нейкая глабальная катастрофа, якую нічога не абяцае. Таму, верагодна, працэс гэты расцягнецца на гады.

**АЛЕГ МАНАЕЎ, САЦЫЁЛАГ:**

## “БЛІЖЭЙШЫМ ЧАСАМ НІЧОГА НЕ ЗМЕНІЦЦА”

Не выйдуць. Прынамсі да 25-га сакавіка. І абмяркоўваць няма чаго. У больш далёкай перспектыве... Гэта абстрактная размова. А бліжэйшым часам нічога істотна не зменіцца. І ні ініцыятыва Змітра Бандарэнкі (*які першы прапанаваў запрасіць улады адзначыць Дзень Волі разам з апазіцыяй – рэд.*), ні нешта іншае нічога не зменіць. Гэта ўсё далёка ад рэчаіснасці. Тэарэтычна можна разважаць, што марсіяне да нас прыляцяць, Пуцін нешта вырашыць, Еўропа ўмяшаецца. Але не прыляцяць, не вырашыць і не ўмяшаецца.

**УЛАДЗІМІР МАЦКЕВІЧ, ФІЛОСАФ:**

## “ЛЮДЗІ НЕ БАЧАЦЬ У ГЭТЫМ СЭНСУ”

Калі людзі ўбачаць сэнс у гэтым, яны будуць гэта рабіць. Без сэнсу гэта робяць толькі рэлігійныя фанатыкі. Ці людзі, якім трэба бавіць час. У 1996-м годзе сэнс быў, нават у 97-м быў. Потым нейкі сэнс з’яўляўся падчас выбараў. А каляндарныя святы адзначаюць толькі зацятыя фанатыкі. Таму сёння, калі вядзецца спрэчка – выходзіць на плошчу 19-га ці 25-га, сэнсу гэта не мае аніякага. Сэнс можа з’явіцца, калі ўлады, напрыклад, пакрыўдзяць чалавека, які карыстаецца безумоўнай падтрымкай і даверам людзей. Тады людзі пойдуць яго абараняць. Але ж чым далей улады прызвычайваюць да сённяшняга становішча насельніцтва, тым больш чорную справу яны павінны ўтварыць, каб людзі абурыліся. Тое, што робіцца сёння, дзесяць гадоў таму вельмі моцна абурала б людзей. А сёння яны не рэагуюць. Бо часткова людзі ўжо падкупленыя заробкамі і крэдытамі, і яны свядома з гэтым мірацца. Я не кажу, што гэта добра. Наадварот, гэта вельмі дрэнна, але мы з гэтым павінны лічыцца. Такая сітуацыя.

**ТАЦЯНА, ХАТНЯЯ ГАСПАДЫНЯ:**

## “ГРАМАДСТВА НЕ МОЖА ДОЎГА ЗАСТАВАЦЦА Ў СТАНЕ НЕРУХОМАСЦІ”

У кожным чалавеку закладзеная прага пераменаў. Дзеля чаго мы, напрыклад, робім перастаноўку мэблі? Не дзеля ж прыгажосці. Так і з грамадствам. Яно, мне здаецца, не можа доўга знаходзіцца ў стане нерухомасці, ці аднастайнасці. Бо ўсё павінна развівацца. Альбо дэградаваць. І калі назапасіцца гэтая прага зменаў, будзе сапраўдны выбух. Мэбля ў нас переставіцца з пылам і грукатам. І здаецца мне, штуршком да гэтай перастаноўкі можа паслужыць зусім, на першы погляд, нязначная падзея. Ніякія не выбары. У кожнага можа быць свой матыў.

# ГЭТА САЛОДКАЕ СЛОВА – СВАБОДА

## ЯШЧЭ НЕ ЎСЕ Ў БЕЛАРУСІ ЗМІРЫЛІСЯ З ПАРАДКАМ РЭЧАЎ

Працяг са стар.1

ную аперэту на рэвалюцыйную тэму. Але сама назва, ды й тэма ў той час лашчыла слых савецкай інэлігенцыі.

Усяго праз год у рэальнай лацінаамерыканскай краіне Чылі адбыўся ваенны пераварот, і мы ўбачылі дакументальныя кадры, дзе звычайных людзей жаўнеры хапалі на вуліцах і ў кватэрах, збівалі, кідалі ў машыны, падобныя на аўтазакі – адным словам, тое, што зрабілася звычайнай карцінай для сённяшняй Беларусі.

Тады ў Савецкім Саюзе ладзіліся мітынгі і канцэрты салідарнасці са зняволенымі, зніклымі і забітымі ў далёкай Чылі. І вельмі многія сапраўды адчувалі шчырае пачуццё салідарнасці з чылійскімі вязнямі. Хоць пры гэтым не думалі, не хацелі думаць пра вязняў сумлення ў савецкіх лагерах. (Праўду кажучы, іх было няшмат).

І вось праз трыццаць гадоў нашчадкі савецкіх людзей у сённяшняй Беларусі хутчэй гатовыя спачуваць ахвярам бамбаванняў у Іраку, ці палестынскім тэрарыстам, чым уласным дзецям і ўнукам. Яны звыкла не адчуваюць салідарнасці з тымі, хто яшчэ не зміраўся, у адрозненне ад большасці, з уладай, з адсутнасцю свабоды ў сваёй краіне.

Чылійскі дыктатар Пінаčэт заплаціў праз шмат гадоў за ўсё не столькі судовым пераследам і хатнім арыштам, колькі ганьбай і нянавісцю суайчыннікаў – сваякоў загіблых і зніклых.

Ці можна ўявіць сабе, каб чылійскія камуністы і сацыялісты пры дыктатуры запрасілі Пінаčэта на якое-небудзь свята, ці маніфестацыю? Ці можна ўявіць, каб дзеячы антыкамуністычнай "Салідарнасці" у Польшчы падчас ваеннага стану запрасілі генерала Ярузельскага разам адсвяткаваць Дзень польскай незалежнасці?

Беларуская "сістэмная" апазіцыя зноў давяла, што ёй няма роўных у свеце – яна запрасіла Лукашэнку адзначыць разам з ёй 25 сакавіка Дзень Волі на Кастрычніцкай плошчы. Справа не ў тым, ці раіліся перад тым лідэры апазіцыі з маладымі людзьмі, якія заставаліся на плошчы, нягледзячы на ўгаворы гэтых лідэраў. Яны й самі не вераць у тое, што кіраўнік дзяржавы зверне ўвагу на іх заклік. Але навошта было дэманстраваць адсутнасць уласнай годнасці. І навошта было заяўляць пасля гэтага пра падтрымку арыштаваных маладафронтаўцаў? Няўжо ў кагосьці з апазіцыянераў ёсць ілюзія, што вышэйшая ўлада не мае да гэта дачынення?

Тым, хто, магчыма, сапраўды яшчэ захаваў ілюзіі, Лукашэнка адказаў у сваім інтэрв'ю агенцтву "Рэйтэр". Паводле яго словаў, не можа быць нават размовы пра тое, каб Беларусь пагадзілася на «невыканальныя патрабаванні» Еўрасаюза наконт свабоды СМІ, свабодных выбараў і вяршэнства закону, якія летась былі вылучаныя Еўракамісіяй дзеля паляпшэння адносін ЕС і Беларусі.

Вы яшчэ сумняваецеся? Тады хутка прыедуць і за вамі.

**А. Уласаў**

# АПАЗІЦЫЯ ЗАПРАСІЛА ЛУКАШЭНКУ НА ДЗЕНЬ ВОЛІ

Дэмакратычныя сілы Беларусі падалі заяву ў Мінскі гарвыканкам аб правядзенні 25 сакавіка а 12 гадзіне на Кастрычніцкай плошчы акцыі, прымеркаванай да 89-й гадавіны стварэння Беларускай Народнай Рэспублікі. Пра гэта паведамілі на прэс-канферэнцыі ў Мінску лідэры палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў, якія ўваходзяць у аргкамітэт святкавання Дня Волі. Дэмакратычныя сілы таксама накіравалі Аляксандру Лукашэнку зварот, у якім папрасілі яго дазволіць правесці акцыю 25 сакавіка і асабіста ўзяць удзел у святочных мерапрыемствах.



**Аляксандр Мілінкевіч на** *пасяджэнні аргкамітэту па святкаванні Дня Волі. Мінск, 5 лютага 2007 году.*

"Мы ўпэўненыя, што такая акцыя толькі падкрэсліць у вачах міжнароднай супольнасці ўяўленне пра Беларусь як пра сапраўды незалежную і суверэнную дзяржаву, гатовую на рэальныя крокі дзеля дэмакратызацыі, пералічаныя таксама і ў звароце Еўракамісіі ад 17 лістапада 2006 году. Адным з такіх крокаў мусіць стаць спыненне пераследу за грамадска-палітычную дзейнасць, рэалізацыя права на свабоду мірных шэсцяў і мітынгаў", – гаворыцца ў звароце.

Раней выказваліся розныя думкі адносна таго, калі і ў якім месцы трэба праводзіць масавую акцыю. Лідэр Аб'яднанай грамадзянскай партыі Анатоль Лябедзька, напрыклад, а таксама частка маладых удзельнікаў леташніх пратэстаў прапаноўвалі адзначыць гадавіну 19 сакавіка.

Як заявіў лідэр БНФ Вінцук Вячорка, 25 сакавіка беларусы таксама павінны ўзгадаць "гераічныя падзеі ў Мінску 19–25 сакавіка 2006 года, якія прадэманстравалі і абудзілі дух дзясяткаў і сотняў тысяч беларусаў".

Лідэр дэмакратычных сілаў Беларусі Аляксандр Мілінкевіч выказаў меркаванне, што "незалежнасць краіны па-ранейшаму пад пагрозай. І мы павінны абавязкова сказаць, што дэмакратычныя сілы Беларусі жорстка трымаюць пазіцыю незалежнасці". Ён назваў "вельмі слушным зварот да Лукашэнкі. Ніхто не зніме з улад адказнасці за рэпрэсіі супраць іншадумцаў, але ўлада мае апошні шанец пачаць рэформы. Я не вельмі ў гэта веру, але, магчыма, пагроза страціць уладу чаму-небудзь іх навучыць…

Дзень волі – вельмі важнае свята, і яно мусіць святкавацца выключна на плошчы Каліноўскага. Гэта прынцыпова і маральна. Калі мы пойдзем у іншае месца, мы здрадзім самім сабе", – лічыць Аляксандр Мілінкевіч.

Рашэнне правесці акцыю 25 сакавіка падтрымалі таксама прадстаўнікі АГП, БСДП (Грамада), Рада беларускай інтэлігенцыі, некаторых іншых палітычных і грамадскіх арганізацыяў.

**Паводле СМІ**

# НАФТАВЫ КАНФЛІКТ: ПРАЦЯГ БУДЗЕ?

## НАПРУЖАННЕ ВАКОЛ ТРАНЗІТУ РАСІЙСКАЙ НАФТЫ ПРАЗ БЕЛАРУСЬ НЕ ЗНІЖАЕЦЦА

Расійская кампанія "Транснафта" зацвердзіла тэхнічны праект будаўніцтва нафтаправоду ў абыход Беларусі. Аб рашэнні развіваць Балтыйскую трубаправодную сістэму на кірунку Ўнеча – Прыморск заявіў 5 лютага прэзідэнт кампаніі Сямён Вайншток.

Паводле ягоных словаў, гаворка ідзе найперш пра павелічэнне прапускнога аб'ёму партовага тэрміналу на 50 мільёнаў тонаў нафты на год. Вайншток заяўляе, што праект "вельмі й вельмі" дарагі, аднак калі б ад суседніх дзяржаваў не было такіх рызыкаў, дык траціць гэтулькі вялікія грошы не давялося б.

У 2006 годзе праз Балтыйскую трубаправодную сістэму было транспартавана больш за 74 мільёны тонаў нафты, праз беларускую тэрыторыю – 78,7 мільёнаў тонаў, паведамляе БелаПАН.

Між тым, як паведаміла Міністэрства эканомікі Беларусі, ад 15 лютага тарыфы на транзіт расійскай нафты ўзрастуць на траціну. Як паведамляе БелаПАН, на маршруце Ўнеча-Мазыр-Адамава (краіны дастаўкі – Германія й Польшча) тарыф за 1 тону нафты павялічваецца з 2,6 да 3,5 даляра (больш як на 34%), на маршруце Ўнеча-Мазыр-Броды (Венгрыя, Славакія, Чэхія, Украіна) – ад 1,14 да 1,5 даляра (на 31,5%).

Мінэканомікі падкрэслівае, што тарыфы прынятыя «з разліку сярэдняга ўдзельнага тарыфа на транспартаванне нафты па сістэме «Транснафты" на тэрыторыі Расійскай Федэрацыі – 0,6 даляра за 1 тону на 100 км маршруту.

Між тым, міністр эканамічнага развіцця РФ Герман Грэф заявіў, што Беларусь можа падвысіць стаўку на транзіт нафты толькі пасля заключэння двухбаковага пагаднення з Расіяй.

**Аглядальнік**

# $1,5 МІЛЬЁНА ХАБАРУ ЗА ЗЯМЛЮ

## МІНСКІЯ ЧЫНОЎНІКІ ЗАСТАЮЦЦА ВЫШЭЙ ЗА ПАДАЗРЭННІ?

*Пра крымінальную справу аб хабары ў 1,5 мільёна даляраў – самым буйным у гісторыі Беларусі – паведамілі ўсе дзяржаўныя СМІ. Аднак, некаторыя цікавыя падрабязнасці, абыйдзеныя ўвагай дзяржаўнай прэсы, апублікавала электронная газета "Ежедневник". Прапануем увазе нашых чытачоў фрагменты публікацыі.*

Сем мільёнаў даляраў за 20 га пад Мінскам -- гэта нармальная цана. Аб гэтым на судовых слуханнях заявілі абвінавачаныя. Паводле следства, перададзеныя ў якасці авансу 1,5 мільёна даляраў не прызначаліся для службовых асобаў. Аднак, агучаныя ў судзе факты прымушаюць у гэтым усумніцца.

Прыканцы 2005 году фірма Аляксандра Пашука сутыкнулася з фінансавымі цяжкасцямі. Сябры параілі яму звярнуцца да прадстаўніка маскоўскага ТАА "Міракс Груп" Кацяшова, які, нібыта, быў зацікаўлены ў інвеставанні сродкаў на тэрыторыі Мінска, Мінскага раёна альбо вобласці. Пашук звярнуўся праз свайго супрацоўніка да Алега Жукоўскага, які абяцаў дапамагчы вырашыць пытанне праз свае сувязі.

Жукоўскі быў цэнтральнай асобай у справе. Ён абвінавачваўся, у прыватнасці, у падбухторванні да хабару ў 150 тысяч даляраў супрацоўнікам МУС за вызваленне з-пад варты асуджанага сябра злачыннай групоўкі "Пасялковая" Генадзя Логінава. Той фігураваў у скандальнай справе аб стварэнні сайтаў дзіцячай парнаграфіі ў інтэрнэце.

У той момант, калі да Жукоўскага звярнуліся з просьбай дапамагчы, той акурат вырашаў пытанне аб набыцці для сябе пад Мінскам 1,2 га зямлі пад будаўніцтва шматкватэрнага дома. Ён, у сваю чаргу, звярнуўся па дапамогу да Мікалая Пянкрата і Віктара Баброўніка. Баброўнік заявіў у судзе, што хоць ён і меў у Мінскім гарвыканакаме патрэбныя сувязі, але ўсё рабіў паводле закону, а галоўнае – без карысці для сябе.

Між тым, Пянкрат і Баброўнікаў абвінавачваюцца ў вымаганні хабару ў 500 тысяч даляраў ад Жукоўскага за вылучэнне таго самага ўчастку пад Мінскам. 15 тысяч даляраў Пянкрат паспеў атрымаць і перадаць частку Баброўніку – "на жыццё".

Для каго, усё ж такі, прызначаліся 7 мільёнаў даляраў? Як стала ясна ў судзе, за ўчастак у 20 га ў вёсцы Копішча з расейцаў патрабавалі спачатку 3 мільёны даляраў, потым цану ўзнялі да 7 мільёнаў, бо гэтая ж зямля была абяцаная мэру Масквы Лужкову для будаўніцтва на ёй жылля фірмамі, якім той спрыяе. Праўда, афіцыйна гэты факт нідзе не фігуруе.

Следства вырашыла, што беларускія прадпрымальнікі проста падманулі маскоўскіх партнёраў, спасылаючыся на сувязі ў рай- і аблвыканкамах. У якасці гарантыі Кацяшову з "Мірамакс Груп" было прапанавана самому прыйсці ў выканкам і забраць пісьмо за подпісам старшыні, пасля чаго перадаць першы ўнёсак.

Але Кацяшоў нечакана адмовіўся. Потым экспертыза пакажа, што рэзалюцыя чыноўніка на пісьме была падробленая Баброўнікам. Той, праўда, катэгарычна гэта адпрэчвае.

Як піша аўтар "Ежедневника", сёння ўжо відавочна, што самы буйны хабар у гісторыі Беларусі быў эксперыментам супрацоўнікаў Упраўлення па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю МУС. "Прадстаўнік маскоўскай кампаніі" Кацяшоў быў падстаўной асобай. Не зразумела толькі, чаму ён асабіста не забраў у выканкаме ліст з рэзалюцыяй, бо тады ўдалося б злавіць таго, хто гэты ліст падпісаў.

Сёння ўсе названыя ў матэрыяле (акрамя "маскоўскага" госця) затрыманыя знаходзяцца пад судом, ім "свецяць" тэрміны.

**Паводле *www.tut.by***

# СКАЖЫ, ХТО ТВОЙ СЯБРА...
## НАДЫШОЎ ЧАС ДРАЖНІЦЬ КРАМЛЁЎСКІХ ГУСЕЙ?

На мінулым тыдні у Мінск, нібы птушкі з выраю пацягнуліся дзеячы расійскай апазіцыі. Гэта сведчыць пра тое, што з тымі, хто зараз пры ўладзе ў Крамлі, Лукашэнка размаўляць ужо (ці пакуль) не здатны.

Першым прыляцеў кіраўнік камуністычнай партыі Расійскай Федэрацыі Генадзь Зюганаў. Раней ён часта гасцяваў у Аляксандра Лукашэнкі, аднак а ссchallenge апошнім часам яны бачыліся досыць рэдка. Справа у тым, што гэта ў 1996 годзе Зюганаў быў палітыкам з рэальным уплывам, кандыдатам на пасаду прэзідэнта з істотнымі шанцамі на перамогу. А пасля прыходу да ўлады Уладзіміра Пуціна старшыня камуністычнай партыі паступова згубіў палітычную вагу. Таму і Лукашэнка пэўны час не запрашаў да сябе Зюганава: навошта ён патрэбны? Хіба толькі крамлёўскіх гусей дражніць.

Але час дражніць гусей надышоў. Мала таго, што Лукашэнка прыняў Зюганава дык яшчэ пад час гутаркі з ім зрабіў некалькі абразлівых заяваў кшталту: "Здыхлінай смярдзіць ужо ад Масквы да Мінску" (гэта пра тое, што Беларусь пачынаюць душыць на загад Крамля), "Расія дрыжыць на задніх лапках перад амерыканцамі".

Праз пару дзён сталіцу Беларусі наведаў яшчэ адзін вядомы расійскі імперыяліст-маргінал, рэдактар фашысцкай газеты "Завтра" Аляксандр Праханаў. Ён наогул апошні раз быў у Лукашэнкі шэсць год таму. Інтэрв'ю з кіраўніком Беларусі "Завтра" пакуль не надрукавала, але вядома, што і на сустрэчы з Праханавым Лукашэнка скардзіўся на Крэмль і крытыкаваў Пуціна. У прыватнасці, ён заявіў, што цэны на газ і мыта на нафту былі ўзнятыя паводле простага ўказання прэзідэнта Расіі.

Цікава тое, што акурат цяпер "Завтра" на сваіх старонках вядзе актыўную кампанію за тое, каб Пуцін застаўся прэзідэнтам Расіі на трэці тэрмін. Да абгрунтавання неабходнасці гэтага кроку на мінулым жа тыдні быў прыцягнуты такі вядомы беларусам спецыяліст, як былы міністр замежных справаў нашай краіны Іван Антановіч.




**Шматвектарнасць.** *belzhaba.com*

Цікава, як яго прэзентуе газета "Завтра": "Многих ли вы знаете партийных чиновников времен СССР, кадровых дипломатов, работавших в 70-80-х на Западе, которые после крушения страны в 91-м не скурвились бы, не превратились в одночасье в «теоретиков либерализма» и «практиков приватизации», не пересели из советских кабинетов в кресла директоров нефтяных кампаний и металлургических заводов? Вы мало найдете таких. А сколько из «старорежимных бойцов» оказались годны сослужить службу своей Родине в новых тяжелых условиях, не растеряли свой профессионализм за годы увядания Империи в 80-х? Белоруссии в этом повезло. У Белоруссии есть Иван Иванович Антонович".

Пасля такіх кампліментаў цяперашні кіраўнік краіны мусіў абурыцца. Атрымліваецца, што ў Беларусі ёсць не толькі ён, Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка, але нейкі Іван Іванавіч Антановіч.

Аднак жарты жартамі, а звярнуць увагу варта вось на што. Апошнім часам нават сярод нацыянальна арыентаваных людзей ізноў пачала гуляць думка пра тое, што Лукашэнка – хай сабе і дыктатар, але абаронца суверэнітэту. І што цяпер ужо ён пераарыентаваўся, і незалежнасць Беларусі ніколі нікому не аддасць.

Гэта даволі распаўсюджаная і таму небяспечная памылка, бо часткова яна грунтуецца на праўдзівых падставах. Прыкладам, Масква настойліва прапануе Мінску ўвесці адзіную валюту, што дэ-факта магло б стаць канцом незалежнасці. Чарговы раз пра гэта Пуцін заявіў на мінулым тыдні падчас прэс-канферэнцыі. Усе чакалі, што расійскі прэзідэнт адкажа на апошнія выпады свайго беларускага калегі. Але Пуцін гэтым разам быў надзвычай лагодны і карэктны. Ён нагадаў, што Расія адмыслова не падвышала кошты на энерганосьбіты для Беларусі ў 2006 годзе, каб не ствараць Лукашэнку праблем на прэзідэнцкіх выбарах, і заклікаў рухацца далей па шляху стварэння саюзнай дзяржавы.

Вядома, што менавіта Лукашэнка і ягоная каманда цяпер супраціўляюцца ўвядзенню расійскага рубля. Ды й наогул інтэграцыя замарудзілася, таму што цяпер яна нявыгадная кіраўніку Беларусі. Аднак рабіць на гэтых падставах доўгатэрміновыя высновы нельга. І гэта чарговы раз засведчыла на мінулым тыдні "кола сяброў" Аляксандра Лукашэнкі.

Яшчэ раз прыгадаем, хто сярод іх: Генадзь Зюганаў, які заклікае да аднаўлення СССР, Аляксандр Праханаў, ідэолаг імперыялізму, для якога ўсе постсавецкія дзяржавы – гэта недарэчнасць... Можна яшчэ згадаць Уладзіміра Жырыноўскага, якому Аляксандр Лукашэнка разам з юбілейнымі віншаваннямі дасылаў дары беларускай зямлі. Неўзабаве пасля гэтага лідар ЛДПР запатрабаваў скасаваць незалежнасць нашай краіны.

Ці можа кіраўнік дзяржавы, які паважае яе суверэнітэт, сябраваць з падобнымі персанажамі? Адказ на гэтае пытанне відавочны. Старыя расійскія груганы кружаць над Беларуссю, і таму мы мусім памятаць, што яе лёс сёння, на жаль, застаецца ў ненадзейных руках.

**Валер Філін**

Саюздрук

# АДЗІНЫ ХАЎРУСНІК

## АЛЬБО ЯК ДЗЯРЖАЎНЫЯ ЖУРНАЛІСТЫ РОДНУЮ МОВУ ЎСПОМНІЛІІ

Радзеюць шэрагі абаронцаў сённяшняга кіраўніка Беларусі сярод расійскай палітычнай эліты. Яшчэ колькі гадоў таму са старонак беларускага афіцыёзу не сыходзілі імёны кіраўнікоў думскіх фракцыяў ды чырвоных губернатараў. Сёння за маральнай падтрымкай ужо не звернешся ні да спадара Жырыноўскага, ні да таварыша Тулеева. Наша ўрадавая газета "Рэспубліка" ўслед за кіраўніком дзяржавы знайшла агульную мову з рэдактарам фашысцкай газеты "Заўтра" Аляксандрам Праханавым. І вось якія тайны адкрыў нам вядомы пісьменнік.

*"Сибирская нефть, которая течет в Европу через Беларусь, давно не русская. Это нефть Абрамовича, который на барыши от ее продажи купит еще одну яхту. Это нефть Алекперова, который вкладывает прибыли в бензоколонки Америки. Это нефть Вексельберга, который откупается от русских «иванов-дураков» пошлыми яйцами Фаберже. Треть денег, полученных от продажи этой нефти, оседает в офшорах. "Стабилизационный фонд" пополняется долларами от продажи "русской нефти". Но он уже не принадлежит России, а питает экономику США, в том числе и войну в Ираке…*

*Если такая политика будет продолжаться, то есть политика по существу выталкивания Беларуси из зоны российского влияния, это неминуемо приведет к очередной геополитической беде. Ведь для России уже почти замкнулся балтийско-черноморский кордон из враждебных пронатовских государств. Остались одни врата в Европу – Беларусь… И в этих условиях мы сами же захлопываем это окно, через которое можем протянуть руку аж до Берлина, всеми силами избавляемся от своего, по сути, единственного стратегического союзника".*

... Рэальная гісторыя. Адзін беларускі бізнесовец, які асеў у Маскве, вырашыў наладзіць вытворчасць паркету пад Гомелем. Усё было цудоўна да тае пары, пакуль прадпрыемства не запрацавала на ўсю катушку. Адразу з боку дзяржавы з'явілася маса ўмоваў. І на калгас дай, і на чарговую пасяўную, і таму заплаці, і гэтаму. Карацей, не далі працаваць на карысць радзіме. У адчаі прадпрымальнік вырашыў перавесці вытворчасць на Браншчыну. І законы больш ліберальныя, і падаткавая палітыка больш талковая. Але ўсё скончылася правалам. Ён проста не знайшоў там людзей для працы. Хто іх спаіў і разбэсціў, развучыў працаваць? Вексельберг ці Буш? Дзе сядзяць галоўныя ворагі Расіі? У Вашынгтоне ці ў Злынцы і Вышнім Валачку? І дзе тая магутная рука, якой спадар Праханаў збіраецца цягнуцца ажно да Берліна?

А журналіст газеты "Беларускі час" наведаў Львоў, дзе з ім здарылася зусім іншая, жудасная гісторыя.

*"Порядком вымотавшись, наша компания в очередной раз наугад свернула на одну из улиц. В тот момент мы и приметили двоих ребят, которые развязной походкой шли за несколько метров от нас... На удивление, львовские парни сразу бить не стали, решили подразнить утренних незнакомцев, поочередно толкая в бок то одного, то другого. Озлобленно они спрашивали у наших ребят: "Грошы ёсць?" Поскольку монтировку мы с собой прихватить как-то не додумались, отбиваться было нечем – разве что ноутбуком, который постоянно носил с собой один из наших друзей. Но так как компьютер было жалко, наши парни применили единственно действенное, как оказалось, оружие. Они резко вспомнили «родную мову» и объяснили львовским вымогателям по-белорусски, кто мы, что мы и зачем. Чудесным образом родная речь подействовала на украинцев. Они отстали от нас только за то, что мы белорусы".*

Калі родная мова падаецца прыўладным пісакам роднаю і блізкай адно ў экстрэмальных сітуацыях, дык застаецца іх толькі пашкадаваць. Шкада, што Львоў занадта далёка, а ў Гродне ці Мінску беларусаў няма каму выхоўваць. Але ж які дзейсны спосаб!

І на завяршэнне яшчэ адна цытата:

*"На это были выделены немалые государственные деньги. Однако жители Луговой Слободы вряд ли понимают, на что они были потрачены. Ведь в жизни их деревни, ставшей в прошлом году агрогородком, по сути, мало что изменилось. Полуразрушенный Дом быта, закрытая на железный замок баня... Нерадостную картину сельского "комфорта" дополняла неблагоустроенная территория вокруг 10 новых домиков, построенных за два последних года в Луговой Слободе. Ни заборов, ни хозяйственных построек, ни улиц с асфальтным покрытием."*

Гэта піша не зламысная "Народная воля". Гэта – "Советская Белоруссия". Карціна падаецца як нешта незвычайнае. Хоць, насамрэч, ніякага дзіва тут няма. Калі трэба хутка "асвоіць", што ў выпадку аграгарадкоў значыць — закапаць грошы, дык яны і "асвойваюцца" адпаведным чынам. Нядаўна ўведаў цікавую рэч. Адзін кіламетр бетонных агароджаў, якімі ўпрыгожваюць аграгарадкі, каштуе роўна столькі, колькі адзін новы трактар "Беларусь". Але набыць яго гаспадарка не можа. І дырэктар тут не вольны. Грошы дадуць толькі пад агароджы ды плітку. Бо гэта ўжо не прагматычная вёска, не кемлівае мястэчка. Гэта загадкавы "аграгарадок".

**Алесь Канюціч**

Як робяцца хвалі

# НЕ ЕШЦЕ ЛЮДЗЕЙ

## АЛЬБО ДЗЕСЯЦЬ ПАЛІТЫКАЎ ЛЕПЕЙ ЗА АДНАГО

Ішлі, ішлі, кажух знайшлі – аб'ядналая апазіцыя аб'ядналася супраць Мілінкевіча. А вось незалежныя беларускія журналісты – наадварот – аб'ядналіся "за", але гэта радуе яшчэ менш.

Што я маю на ўвазе? На ўсіх радыёстанцыях гучаць адныя й тыя ж 10 палітыкаў, адныя й тыя ж 10 палітолагаў. Рэгіянальныя карэспандэнты перадаюць свае паведамленні з адных і тых жа 10 гарадоў. Якраз тут сярод журналістаў хацелася б максімальнай разнастайнасці і здаровай канкурэнцыі. Калі да Радыё Свабода і Палоніі далучыліся Еўрарадыё і Рацыя, я чакаў, што яны зоймуць сваю "экалагічную нішу". Але замест сеткі карэспандэнтаў у еўрапейскіх краінах ствараюцца сеткі ў Беларусі. А палітыкі і палітолагі з Еўропы – рэдкія госці.

Хаця, калі параўнаць з дзяржаўным радыё, дзе гучыць адзін палітык, ён жа і палітолаг, нашы незалежныя станцыі выглядаюць даволі прыстойна.

Моўная заўвага. 5 лютага на Еўрарадыё карэспандэнт Зміцер Траўчук рабіў матэрыял пра перайменаванне вуліц у нашых гарадах. Прыводзіў удалыя і няўдалыя прыклады. Заключнай фразай таго рэпартажу прагучала: "Перш чым перайменоўваць вуліцы, нашым палітыкам трэба паспытаць людзей". Але ж гэта канібалізм! Людзей трэба запытаць, спытацца. А слова "паспытаць" азначае – пакаштаваць. Не ешце людзей.

**Сяржук Вітушка**

Стрэмкі

# “ПАДОЎЖНЫЯ” І “ПАПЯРЭЧНЫЯ”

## ПАЖАДАНЫ ГАЛАЎНЫ ЎБОР ДЛЯ БЯЗДАРНАСЦІ – ЦЯРНОВЫ ВЯНЕЦ

Быў такі савецкі паэт – А.Папярэчны. Аднак нічога “ўпоперак”, наколькі мне вядома, не сачыніў, і яму больш пасавала б прозвішча Падоўжны.

Збольшага ўсіх творцаў можна падзяліць на “падоўжных” і “папярэчных”. Прычым сама прыналежнасць як да адных, так і да другіх меру таленту не вызначае.

Сапраўды, ці ж рабілі Рафаэль, Рубенс ці Дзюрэр нешта насуперак мастацкім густам свайго часу? Проста яны былі на галаву вышэй за сваіх сучаснікаў. Але зусім не імкнуліся рабіць нейкія рэвалюцыі ў мастацтве.

Мастак – закладнік свайго таленту. І творыць пад дыктоўку свайго ўнутранага голасу. І не заўсёды гэты голас гучыць ва ўнісон са сваім часам.

У жыцці Рэмбрандта быў такі эпізод: калі ён не здолеў выплаціць даўгі і быў аб’яўлены банкрутам, і страціў усё, што меў – дом, маёмасць, калекцыі, — сябры змаглі пераканаць магістрат замовіць мастаку гіганцкую (15 м ушыркі) карціну. Безумоўна, ён імкнуўся намаляваць яе як найлепей – яна была для яго выратавальнай саломінкай. Але ён мог яе стварыць толькі як Рэмбрандт, і ніяк іначай. У выніку карціна не была прынята, а потым увогуле парэзана на кавалкі – і грошы, вядома ж, не заплочаны.

Ван-Гог пры жыцці прадаў толькі адну карціну. Але пачытайце ягоныя шматлікія лісты – ці ж стараўся ён знарок абражаць “мяшчанскі” густ? Проста ён не мог не быць Ван-Гогам.

“Папярэчнасць” – злая доля творцы.

Бальшавікі старанна “зачышчалі” ўсіх нязгодных усюды – у культуры, у навуцы, у мастацтве...

У Беларусі практычна не засталося тады “папярэчных” мастакоў – ні ў воднай галіне.

Затое цяпер – іронія лёсу! – у “папярэчныя” трапіў цэлы Саюз пісьменнікаў!

Быць “падоўжным” – выгадна. А затое “папярэчным” – ганарова. І грукочуць у тазікі, дзьмуць у свісткі, усяляк “нарываюцца” – што ж гэта за творца, калі ён не бунтар!

Найбольш пажаданы галаўны ўбор для бяздарнасці – цярновы вянец.

І няма лепшай маскі для канфарміста, чым маска бунтара.

Ведаю аднаго калегу-жывапісца. Натуральна, ён лічыць сябе “некамерцыйным”, “немяшчанскім”, “элітарным”.

Не адзін дзясятак гадоў ён малюе адно і тое ж: нейкія акрываўленыя істоты з лупатымі вачыма, што мітусяцца на велізарных палотнах. Мабыць, так выглядае тое, што з’яўляецца на свет у выніку аборту. Аднак ягоныя опусы карыстаюцца неверагодным поспехам у крытыкаў і калекцыянераў, пад мятлу скупляецца ўсё да апошняга абразка, адна выстава змяняе другую, па ўсім свеце.

Яно б і я здолеў намаляваць гэткія “эмбрыёны” – ды не магу: на ваніты цягне.

А нядаўна калега збудаваў сабе шыкоўны дом па скандынаўскім праекце – шкло, матавае дрэва...

І калі я валакуся паўз яго ў сваё жытло, дзе працякае дах і прыбіральня на вуліцы, думаю часам у роспачы: знайсці б у сабе той “ген папярэчнасці” – ды ножыкам яго, ножыкам! Бо што далі табе бясконцыя трызненні аб вечнай красе?..

Ды вось была ў мяне неяк выстава, на якой я мусіў сам дзяжурыць у суседнім пакойчыку. І бачу раз: прыйшоў нейкі дзядзька – раз абышоў, два, і трэці, а потым – азірнуўся і хуценька пацалаваў намаляваную мною паненку!

І як пасля гэтага маляваць “эмбрыёны”?..

**Алег Аблажэй**



**«Свет страўсаў”.** *Такую назву мае ферма беларуска-польскага прадпрыемства “ПМ і Кампанія”, дзе гадуюцца каля 700 чорных афрыканскіх страўсаў. Яйкі і мяса птушак пастаўляюцца ў крамы на продаж. Вёска Козішча, Кобрынскі раён, люты 2007 году.*

# Невядомая Беларусь

**8 лютага** 1676 году памёр маскоўскі цар Аляксей Міхайлавіч. У расійскую гісторыю ён увайшоў як «цішайшы і дабрэйшы». У беларускую – як пачынальнік трынаццацігадовай вайны, у выніку якой быў забіты альбо забраны назаўсёды ў палон кожны другі жыхар нашага краю. Гарады былі папаленыя, скарбы panішчаныя. Толькі паводле афіцыйных расійскіх крыніц беларускі палон цара Аляксея Міхайлавіча складаў 300 тысячаў чалавек.

**9 лютага** 1886 году нарадзіўся Аляксандр Мяснікоў, адзін з першых камісараў-начальнікаў БССР, які лічыў, што беларусаў як асобнага народу няма. Сапраўднае яго прозвішча Мяснікян.

**10 лютага** 1938 году ў Расіі карныя органы НКВД расстралялі класіка беларускай літаратуры Максіма Гарэцкага. Пакручасты лёс не перашкодзіў Гарэцкаму напісаць сапраўдныя шэдэўры нацыянальнае прозы, кнігі “На імпэрыялістычнай вайне”, “Дзве душы”, “Камароўская хроніка”. Пасля расстрэлу пісьменніка многія ягоныя творы доўгі час былі забароненыя.

**11 лютага** 1807 году нарадзіўся беларускі мастак і кампазітар Напалеон Орда. Ён прыйшоў на свет у Варацэвічах пад Янавам, адукацыю атрымаў у Парыжы і ў Віленскім універсітэце. Яшчэ студэнтам Орда ўдзельнічаў у паўстанні 1831 году. Ён сябраваў з Шапэнам і Міцкевічам, пісаў вальсы, мазуркі, серэнады. Орда шмат падарожнічаў па Беларусі, Літве, Польшчы і Украіне, рабіў замалёўкі. Віды вёсак, маёнткаў, замкаў, палацаў, гарадоў, якія намаляваў Орда — часта адзінае сведчаньне пра помнікі архітэктуры, якіх даўно няма ані ў рэчаіснасці, ані на фота.

**12 лютага** 1839 году ў Полацку пачаўся царкоўны сабор, які пастанавіў беларусаў-уніятаў перавесці ў падпарадкаванне Расійскай Праваслаўнай Царквы. Да гэтага моманту большасць насельніцтва Беларусі належала да уніяцкага веравызнання.

Блакітны агеньчык

# ГЕРАНЁНЫ: ГІСТОРЫЯ КАХАННЯ

## АЛЬБО ШТО ПРАГЛЕДЗЕЎ У СВАІМ ПАДАРОЖЖЫ ДЫЛЕТАНТ?

Прыблізна год таму перадача “Падарожжы дылетанта” была знятая з эфіру на 1-м канале БТ. Матывіроўка дырэкцыі праграм была звычайная – перадача нецікавая, аднастайная паводле формы і зместу. Насамрэч, гэта была адзіная перадача, якая на беларускай мове распавядала пра гісторыю беларускіх гарадоў і мястэчак. І прыхільнікаў у яе было шмат. Аб гэтым сведчыць хаця б той факт, што спроба закрыць перадачу выклікала скандал у недзяржаўнай прэсе. Пра гэта шмат пісалася і ў інтэрнэце. Дарэчы, зусім нядаўна да гэтай тэмы зноў вярнуліся наведнікі ЖЖ (жывога журналу) Minsk_by.

Напэўна ж, былі лісты і тэлефанаванні абураных гледачоў. Так ці йнакш, перадача працягвае выходзіць — толькі ўжо на канале СТВ. І пад назвай “Новыя падарожжы дылетанта”. Рэжысура змянілася мала. Вядучы – “дылетант” Юры Жыгамонт застаўся ранейшы. Дарэчы, імідж вядучага – дзівакаватага інтэлігента ў акулярах, у даўгім чорным паліто і фірмовым капелюшы, з нязменнай старой кайстрай у руках – вельмі запамінальны і ўдалы.

Да месца і з густам робяцца ілюстраваныя ўстаўкі з біяграфічнымі звесткамі гістарычных асобаў, згаданых у перадачах. Самы значны яе плюс – разнастайная геаграфія. За апошні час запомніліся перадачы пра Наваградак, Капыль і вёску Геранёны на Гарадзеншчыне. У апошняй перадачы было шмат найцікавейшай інфармацыі – і пра паходжанне назвы, і пра славуты тамтэйшы замак, пабудаваны Альбрэхтам Гаштольдам, і пра караля Станіслава Ляшчынскага, і канечне – пра гісторыю кахання князёўны Барбары Радзівіл і караля Аўгуста ІІ-га Жыгімонта, якія сустрэліся ў Геранёнах. Шкада толькі, што ўнікальны герб Геранёнаў – сэрца, пранізанае стралой (такое не мела прэцэдэнту ў геральдыцы!) гледачу паказалі ўсяго на некалькі секунд. А ён жа мог паслужыць сімвалам, зачынам перадачы.



Шмат цікавай і нават нечаканай інфармацыі можна было пачуць і ў выпуску пра Капыль. Напрыклад, з яго мы даведаліся пра тое, што на пачатку 16-га стагоддзя на Капыльшчыну прыехалі гандляваць шатландцы, ды заснавалі там некалькі паселішчаў. Але шатландцы даволі хутка асіміляваліся з беларусамі і пабралі беларускія прозвішчы, напрыклад – Аляхновічы.

Нагадалі аўтары і пра трагічны лёс старшыні першага ўраду БССР Змітра Жылуновіча (Цішкі Гартнага), які быў рэпрэсаваны і скончыў жыццё ў доме вар’ятаў пад Магілёвам. Родная хата Жылуновіча захавалася ў добрым стане.

А вось пра яшчэ аднаго выбітнага ўраджэнца Капыля ў “Новых падарожжах” згадаць забылі. Гэта Мендэле Мойхер-Сфорым – вядомы ва ўсім свеце заснавальнік літаратуры на ідыш, аўтар класічных твораў на іўрыце, знакаміты лінгвіст.

Увогуле, як слушна пішуць некаторыя наведнікі інтэрнэту, нельга, гаворачы пра гісторыю беларускіх мястэчак, ігнараваць гісторыю беларускага габрэйства. Лёсы абодвух народаў шчыльна, часам непарыўна звязаныя паміж сабой.

На жаль, аўтары “Падарожжаў” гэты факт чамусьці абыходзяць, забываючы аб тым, што Вялікае княства Літоўскае было самай талерантнай еўрапейскай дзяржаваю ў дачыненні да ўсіх народаў, якія яго насялялі. Якія ўзаемна ўзбагачалі свае культуры і пры гэтым стваралі агульную гісторыю нашай Беларусі.

**Максім Пешкаў**

## ПАДПІСКА НА СВАБОДУ

КАЛІ ВЫ ХОЧАЦЕ АТРЫМЛІВАЦЬ СВАБОДУ ПРАЗ ПОШТУ, ДАШЛІЦЕ ВАШ ПОЎНЫ І ДАКЛАДНЫ АДРАС SMS-ПАВЕДАМЛЕННЕМ НА НУМАР +370 687 42185 АЛЬБО НА E-MAIL: HAZETA@TUT.BY

КАЛІ ВЫ ХОЧАЦЕ ЧЫТАЦЬ СВАБОДУ Ў ІНТЭРНЭЦЕ І Ў PDF-ВЕРСІІ, ЗАХОДЗЬЦЕ НА САЙТ WWW.VILNIA.COM

КАЛІ ВЫ ХОЧАЦЕ АТРЫМЛІВАЦЬ PDF-ВЕРСІЮ СВАБОДЫ, ПАВЕДАМЦЕ НАМ НА E-MAIL HAZETA@TUT.BY ВАШ ЭЛЕКТРОННЫ АДРАС.

**Заснавальнік** ТАА “Тут і цяпер”
**Галоўны рэдактар** А. Уласаў (email: gazeta@tyt.by)
**Адрас** 220013 г. Менск, пл. Каліноўскага, 1-а
**Тыраж** 299 экзэмпляраў